газеты «Хойніцкія навіны» звязана выключна з тэхнічнымі момантамі і не павінна цягнуць за сабой дадатковыя фінансавыя выдаткі.

### Бібліяграфічныя спасылкі


1. О газете // Хойніцкія навіны [Электронный ресурс]. URL: http://www.hoiniki.by/?page_id=3527 (дата обращения: 30.04.2021).
2. *Зелянко С. В.* Гендарныя падыходы да рэдакцыйнай падрыхтоўкі медыятэкстаў // Журналістыка-2015: стан, праблемы і перспектывы : матэрыялы 17-й Міжнар. навук.-практ. канф., 12–13 ліст. 2015 г., Мінск / рэдкал. : С. В. Дубовік (адк. рэд.) [і інш.]. Вып. 17. Мінск : БДУ, 2015. С. 274–277.
3. Контакты // Хойніцкія навіны [Электронный ресурс]. URL: http://www.hoiniki.by/?page_id=3531 (дата обращения: 30.04.2021).
4. *Зелянко С. В.* Методыка рэдагавання : вучэб.-метад. комплекс. Мінск : БДУ, 2017. 88 с.


## ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ ПРАЦЫ ГАЗЕТЫ «КОБРЫНСКІ ВЕСНІК» У ІНТЭРНЭЦЕ


***В. А. Зразікава[1], М. У. Гапанюк[2]***

*[1]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*zrazikova@tut.by,*

*[2]Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*вул. Кальварыйская, 9, 220004, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь,*
*margapanyuk@mail.ru*



У артыкуле разглядаюцца асаблівасці функцыянавання рэгіянальных СМІ ў анлайнавым асяродку, а таксама прынцыпы размяшчэння кантэнту на розных медыйных платформах.

Асобная ўвага нададзена прасоўванню раённай газеты «Кобрынскі веснік» у сацыяльных сетках.

Сёння не ўсе рэгіянальныя СМІ маюць дакладнае ўяўленне аб творчых прыёмах працы ў інтэрнэце і паспяховай стратэгіі дзейнасці, у выніку чаго назіраецца нізкая наведвальнасць інтэрнэт-рэсурсаў пры даволі высокіх друкаваных тыражах.



***Ключавыя словы:*** аўдыторыя; газета «Кобрынскі веснік»; інтэрнэт; інфармацыйны партал vkobrine.by; рэгіянальныя СМІ; сайт; сацыяльныя сеткі.

# THE EFFECTIVENESS OF THE NEWSPAPER «KOBRINSKY VESTNIK» ON THE INTERNET

***V. A. Zrazikava[a], M. U. Gapanyuk[b]***

*[a]Belarusian State University,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: V. A. Zrazikava (zrazikova@tut.by),*

*[b]BelarusianStateUniversity,*
*9, Kalvariyskaya Str., 220004, Minsk, Republic of Belarus*
*Corresponding author: M. Y. Gapanyuk(margapanyuk@mail.ru)*

The article discusses the features of the functioning of regional media in online environment as well as the principles of content placement on various media platforms.

Special attention is paid to the promotion of the regional newspaper «Kobrinsky Vestnik» in social networks.

Today not all regional media outlets have a clear understanding of creative methods on the Internet and a successful strategy of activity, which leads to low traffic on Internet resources with fairly high print runs.

***Key words:*** audience; newspaper «Kobrinsky Vestnik»; Internet; information portal vkobrine.by; regional media; website; social networks.

Пад уплывам тэхналагічных фактараў рэгіянальная медыясістэма Рэспублікі Беларусь прыкметна трансфармуецца. Сёння прыярытэтнымі платформамі спажывання кантэнту і камунікацыі з’яўляюцца новыя медыя (сацыяльныя сеткі, мабільныя дадаткі). Змены закранаюць жанры і тэматыку СМІ, формы і прыёмы прафесійнай дзейнасці, эканамічныя стратэгіі і бізнес-мадэлі, каналы распаўсюджання і дастаўкі інфармацыі.

Аднак большасць раённых газет Беларусі пакуль дэманструюць нізкую актыўнасць у барацьбе за месца ў інфармацыйнай прасторы рэгіёна. Таму тэма даследавання застаецца актуальнай.

Практычным матэрыялам аналізу стала анлайн-дзейнасць раённай газеты «Кобрынскі веснік» (Брэсцкая вобласць). На яе прыкладзе даследуецца эфектыўнасць рэгіянальнай прэсы ў інтэрнэце (стратэгіі прасоўвання, мэтавая аўдыторыя, асаблівасці інтэрнэт-версіі).

Масава-палітычная газета «Кобрынскі веснік» заснавана ў верасні 1939 года. Выходзіць два разы на тыдзень па серадах (8 палос) і суботах

(12 палос), тыраж газеты – 5 тыс. экзэмпляраў, галоўны рэдактар – Раман Васільевіч Мельнік. У ліпені 2017 года зроблены рэдызайн сайта vkobrine.by. Новы сайт адрозніваецца візуалізацыяй, адаптаваны для мабільных прылад і адпавядае ўсім сучасным стандартам інтэрнэт-журналістыкі [1].

Газета «Кобрынскі веснік» прадстаўлена ў Facebook, Twitter, Одноклассниках, ВКонтакте, Instagram, YouTube, Telegram і Viber.

Кантэнт такіх сацыяльных сетак, як Facebook (1 тыс. 757 падпісчыкаў), Twitter (4 тыс. 322 падпісчыкі), Одноклассники (11 тыс. 350 падпісчыкаў) и ВКонтакте (8 тыс. 448 падпісчыкаў) ідэнтычны: лід, спасылка на афіцыйны сайт, фота- ці відэаілюстрацыя. Усе прыведзеныя ў артыкуле статыстычныя звесткі актуальныя на 1 мая 2021 года.

Як сведчыць акаўнт газеты ў Instagram, інфармацыя «пераўпакоўваецца» толькі пад гэту сацыяльную сетку: пост адразу змяшчае тэкст, таму не трэба пераходзіць на інфармацыйны партал. Акрамя гэтага, Instagram газеты рэгулярна папаўняецца актуальнымі афішамі, якіх няма на самім сайце.

У Telegram і Viber выкарыстоўваюцца кароткія загалоўкі і гіперспасылка на сайт-крыніцу. Пры гэтым аўдыторыя Telegram – 139 падпісчыкаў пры колькасці праглядаў да 30 за суткі. Афіцыйная група раённай газеты ў Viber (307 удзельнікаў) пазіцыянуе сябе як чат, дзе можна абмеркаваць публікацыі, выказаць думкі, пажаданні па грамадска значных пытаннях, падзяліцца навінамі, задаць пытанні.

У апошні час актыўна развіваецца YouTube-канал (43 падпісчыкі): у асноўным рэдакцыя размяшчае віншаванні са святамі ад прадстаўнікоў улады, прадпрыемстваў, арганізацый і грамадскіх аб’яднанняў.

Інфармацыйны партал vkobrine.by не з’яўляецца аналагам газеты. Часцей за ўсё матэрыялы адаптуюцца пад сайт, утрымліваюць вялікую колькасць здымкаў. Абавязкова ўносяцца праўкі ў загалоўкі, якія змяшчаюць дзеясловы, назву горада, што дапамагае пошукавай сістэме хутчэй знаходзіць канкрэтную інфармацыю. Доступ да сацыяльных сетак маюць некалькі журналістаў, у тым ліку і адміністратар (рэдактар) сайта. Чытачы таксама могуць прапаноўваць свае навіны, аднак публікацыя такіх матэрыялаў магчыма толькі пасля праверкі мадэратара. Навіны дабаўляюцца ў сацыяльныя сеткі (ВКонтакте, Telegram і Twitter) аўтаматычна, пасля публікацыі на сайце.

Ацэньваючы эфектыўнасць працы раённай газеты «Кобрынскі веснік» у інтэрнэце, можна адзначыць, што рэдакцыя стварае якасны

кантэнт на розных платформах, выкарыстоўваючы разнастайны набор жанраў і фарматаў, адаптуючы матэрыялы да сайта і да сацыяльных сетак (у прыватнсці, у Instagram прымяняюцца больш сціслыя формы, у Twitter – хэштэгі, у Viber – чат для камунікацыі).

Колькасць праглядаў на сайце вагаецца ад 91 да 2 тыс. 536 (звесткі на 1 мая 2021 года). Статыстыка сайта адсочваецца з дапамогай інтэрнэт-сэрвісу Яндекс.Метрики. Ніжэй прыведзена інфармацыя па некаторых з такіх паказчыкаў.




*Малюнак 1*. Колькасць наведвальнікаў сайта за тыдзень (28.04-04.05)




*Малюнак 2*. Крыніцы трафіка сайта




*Малюнак 3.* Тып прылад і ўзрост наведвальнікаў сайта

Безумоўна, прасоўванне сайта ў інтэрнэце ці сацыяльных сетках з'яўляецца інавацыйным інструментам маркетынгу, што дазваляе істотна ўплываць на мэтавую аўдыторыю. Для таго, каб паспяхова гэта рабіць, неабходна вывучыць асноўныя стратэгіі ўзаемадзеяння з аўдыторыяй, яе запыты. Паколькі спецыфіка і мэты ў сацыяльных сетках розныя, павінны адрозніваецца і варыянты падачы інфармацыі.

Нягледзячы на тое, што рэгіянальнае выданне «Кобрынскі веснік» праводзіць актыўную працу ў інтэрнэце, яно не выкарыстоўвае поўнасцю знешнія сэрвісы раскруткі, не дае рэкламу СМІ на іншых пляцоўках, а просоўваннем сайта газеты ў сацыяльных сетках займаюцца выключна журналісты, а не SMM-спецыялісты.

Такім чынам, эфектыўная праца сайта рэгіянальнага СМІ – гэта зладжаная дзейнасць не толькі рэдакцыі, але і спецыялістаў па маркетынгу. Для таго, каб ствараць кантэнт, што зацікавіць сучаснага карыстальніка, трэба ведаць мэтавую аўдыторыю і асаблівасці сацыяльных сетак, актыўна распаўсюджваць інфармацыю па розных каналах, шукаць для гэтага новыя метады і формы.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Інфармацыйны партал Кобрынскага раёна [Электронны рэсурс]. URL: https://www.vkobrine.by/?page_id=890 (дата звароту: 01.05.2021).